Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ КЛУБНІЦ — УСЁ ЛЕТА

Дасведчаныя агароднікі ведаюць, як збіраць па вядзерцы ягады кожны дзень на працягу ўсяго лета. Паспрабуем раскрыць усе сакрэты вялікага ўраджаю клубніц па магчымасці без прымянення мінеральных угнаенняў і пестыцыдаў.

Разнастайнасць сартоў

Калі вы пасля доўгіх пошукаў і эксперыментаў знайшлі прыдатны для вашай зямлі, смачны, духмяны, шыкоўны сорт клубніц... працягвайце пошукі далей! Бо для таго, каб клубніцы цешылі вас на працягу ўсяго сезона, рэкамендуецца мець на агародзе як мінімум чатыры розныя сарты гэтай ягады. А яшчэ лепш — шэсць. Адзін ці два сарты павінны быць ранняспелыя. Два ці тры — сярэдняспелыя. Ну і яшчэ адзін сорт — позні, каб есці свежую ягаду нават у жніўні. Пажадана для кожнага сорту зрабіць асобную градку, прычым так, каб усе градкі апынуліся не побач, а былі раскіданыя па ўчастку. У гэтым выпадку вы зможаце ў поўнай меры ацаніць вартасці кожнага сорту. Вядома, ёсць яшчэ рэмантантныя клубніцы, якія пры належным доглядзе здольныя выдаваць адну хвалю ўраджаю за другой, але ў іх свае правілы і асаблівая агратэхніка.

Мульчыраванне

Мульчыраваць трэба ўсе пасадкі, але клубніцам мульча неабходная як паветра. Ідэальны матэрыял, які мульчыруе, для іх — ігліца. Яна вільгаць захоўвае, ад шкоднікаў і хвароб абараняе, з часам перагнівае і сілкуе градку. Няма ігліцы — не страшна. Для мульчыравання падыходзіць і салома, і скошаная трава, і зрэзанае пустазелле. Восенню пасля збору ўраджаю, абрэзкі і апрацоўкі клубнічных кустоў не зашкодзіць замульчыраваць градкі тоўстым пластом апалай лістоты. Такая мульча і ад маразоў дапаможа ягады зберагчы.

Выдаленне бутонаў у маладых раслін

У пагоні за вялікім ураджаем мы з глыбокай павагай ставімся да кожнай кветачкі на кожным клубнічным кусціку. Аднак такі падыход цалкам непрымальны для маладых раслін першага года жыцця. Задача маладога кусціка — укараніцца, развіць каранёвую сістэму і падрыхтавацца да будучай зімы. Калі ён выдаткуе сілы на плоданашэнне, то верагоднасць вымерзнуць павялічыцца ў разы. Таму будзем бязлітасныя — усе кветкі на першагодках выдаляем без роздуму. Так, сёлета мы не далічыліся дзясятка ягад, затое праз год добра развітыя, магутныя кусты аддзячаць нас багатым ураджаем.

Своечасовы паліў

Мульча істотна памяншае выпарэнне вільгаці з глебы і тым самым скарачае патрэбнасць у паліваx. Але паліваць клубнічныя градкі ўсё ж давядзецца: ягадка ваду любіць. Рэкамендуецца добра паліваць вясной, калі нарастае лісце, падчас цвіцення, у перыяд паспявання ягад, пасля кожнага збору ягад і пасля восеньскай апрацоўкі, калі выдалася засушлівая восень. Выснова: калі дажджы не папрацуюць за нас, паліваць давядзецца ўвесь час. У вясновую і восеньскую пару клубніцы рэкамендуюць паліваць адзін раз на тыдзень. Улетку градкі з ягадамі паліваюць раз у тры дні, а калі стаіць засушлівае надвор'е, то кожны дзень. Некаторыя палівы, натуральна, неабходна сумяшчаць з падкормкамі.

Падкормкі

Падкормліваць звычайныя клубніцы пажадана тры-чатыры разы на сезон: увесну, перад цвіценнем, падчас плоданашэння і ўвосень. З рэмантантнымі клубніцамі справы ідуць па-іншаму: падкормкі раз на тыдзень патрэбны абавязкова, інакш няма сэнсу з імі звязвацца. Чым падкормліваць? Калі вы супраць мінеральных угнаенняў, падкормлівайце градкі настоем травы, біягумусам і попелам. Настой біягумусу робяць так: 1 шклянку біягумусу на 10 літраў вады настойваюць 24 гадзіны, затым разводзяць вадой 50:50. Рэцэпт травянога настою такі: вядро, запоўненае травой, заліваюць цёплай вадой і настойваюць тры-чатыры дні. Попел сыплюць пад корань пасля кожнага збору ўраджаю, а таксама пры восеньскай апрацоўцы.

Выдаленне вусоў

У кустоў, з якіх вы жадаеце збіраць ягады, усе вусы падлягаюць выдаленню. Кампрамісу ў гэтым пытанні няма. Кожны вус адцягвае на сябе вялікую колькасць пажыўных рэчываў, таму калі пра вусы забываюць, ягады становяцца драбнейшыя, страчваюць слодыч, становяцца вадзяністымі і дрэнна захоўваюцца.

У перыяд цвіцення, калі вусы пачынаюць расці не па днях, а па гадзінах, узбройвайцеся нажніцамі і — на градкі. А як жа тады размнажаць клубніцы, калі мы не дазволім развівацца вусам? Правільны падыход такі: клубнічны куст павінен даваць альбо ягады, альбо вусы. Адно з двух.

Абарона ад шкоднікаў

Апошні, але не менш важны пункцік — абарона ад шкоднікаў. Вельмі ўжо не хочацца ўжываць хімічныя пестыцыды на сваіх градках, таму варта прытрымлівацца правіла: лепш шкодніка не падпускаць, чым потым з ім змагацца. Якія існуюць меры прафілактыкі? Па-першае, вясной, калі міне пагроза замаразкаў, можна апрацаваць кусцікі любым біястымулятарам, а праз 14 дзён — біяпрэпаратам «Дачнік» ад самага злоснага клубнічнага ворага — шашолкі. Па-другое, да цвіцення градкі можна накрыць паветра- і вільгацепранікальным матэрыялам — так шкоднікам доступ да кустоў будзе закрыты. Па-трэцяе, не забываем пра фітанцыдныя расліны, пах якіх можа адпудзіць шкоднікаў. Падсаджваем на клубнічную градку цыбулю, часнок, календулу, аксаміткі. Такія змешаныя градкі ўсе насякомыя аблятаюць стараной.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.37	21.42	17.05
Віцебск —	4.19	21.40	17.21
Магілёў —	4.27	21.32	17.05
Гомель —	4.33	21.19	16.46
Гродна —	4.54	21.56	17.02
Брэст —	5.04	21.47	16.43

Месяц

Маладзік у 22.43.
Месяц у сузор'і Блізнят.

Імяніны

Пр. *Ермія.*
К. *Вольгі, Антона, Германа, Люцыяна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Аб'ява ў школе:
Прадам партфель, буквар, дзённік, сшыткі, алоўкі, ручкі, фарбы, калькулятар. Усё амаль новае.
Вова, 1 «Б».

Суддзя пытаецца падсудную:
— Чаму вы атруцілі суседзяў?
— А што мне было рабіць? У краме сказалі, што труціць прусакоў лепш разам з суседзямі.

Алег пойдзе на шашлыкі і парася Бора пойдзе на шашлыкі.
Падобныя фразы, але якія розныя лёсы!

На «хуткай» прывозяць пацыента з пераломам нагі.
— Як гэта здарылася?
— У час гульні.
— У футбол гулялі?
— Не, у карты.
— У карты?!
— Так, мой прыяцель падаваў мне знакі пад сталом.



carcatura.ru

Даты Падзеі Людзі

13 ЧЭРВЕНЯ

У краіне

1702 год — нарадзіўся Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька, ардынат нясвіжскі, вялікі гетман літоўскі, ваявода віленскі. У 1750 годзе заснаваў Нясвіжскую друкарню і адкрыў Нясвіжскі кадэцкі корпус. Заснаваў першыя ў ВКЛ мануфактуры, сярод якіх Навасвержанская фаянсавая, Слуцкая персіярня (мануфактура па вытворчасці шаўковых паясоў). Разам з жонкай Урсулай арганізаваў тэатр, музычную, вакальную і балетную школы, а таксама аркестр народных інструментаў. Памёр у 1762 годзе.

1883 год — нарадзіўся Натан Рубінштэйн, беларускі музыкант, дырыжор, педагог. У 1902 годзе ў Мінску выступаў як скрыпач-саліст і ансамбліст у квартэце. У 1907-м па яго ініцыятыве ў Мінску было адкрыта музычнае вучылішча. Дырыжыраваў Мінскім гарадскім аркестрам. Арганізатар Мінскага таварыства сяброў музыкі. У 1920-х гадах — дырыжор, артыст Першага сімфанічнага ансамбля ў Маскве.

1903 год — нарадзіўся Эдуард Шапко, беларускі акцёр, заслужаны артыст Беларусі. У 1922—1959 гадах працаваў у Беларускім тэатры імя Янкі Купалы. Характарны і камедыйны акцёр. Памёр у 1977 годзе.

У свеце

1843 год — у Расіі выдадзены маніфест аб замене асігнацый і іншых папяровых грашовых знакаў крэдытнымі білетамі.

1895 — у Францыі адбыліся першыя аўтамабільныя гонкі. Хутчэй за ўсіх шлях з Парыжа ў Бардо і назад пераадолеў Эміль Левасо. Сярэдняя хуткасць машыны пераможцы склала 24 кіламетры ў гадзіну.

1928 год — нарадзіўся Джон Нэш, амерыканскі матэматык, эканаміст, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па эканоміцы. Распрацаваў у 50—60-х гадах XX стагоддзя тэорыю гульняў і тэорыю раўнавагі, якую выкарыстоўваюць для вызначэння ўстойлівай стратэгіі гульцоў. Ужыў стратэгію тэорыі гульняў да многіх эканамічных сітуацый.

1958 год — нарадзіліся Сяргей Макавецкі і Аляксандр Яцко, расійскія акцёры.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2225.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 чэрвеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12